# І ВУЧОБА, І АДПАЧЫНАК

На жаль, сёлета супрацоўнікі рэдакцыі газеты «Мы і час» па аб'ектыўных прычынах не змаглі наведаць базу практык «Шчытоўка» і паназіраць, як студэнты біялагічнага факультэта працуюць і адпачываюць на свежым паветры. Але мы не вельмі былі гэтым засмучаныя, бо ведалі, што да нас завітае ў госці загадчык кафедры батанікі Л.М. Мяржвінскі, каб паказаць фотаздымкі ды распавесці пра доўгачаканую для хлопцаў і дзяўчат паездку ў маляўнічы куток Сенненшчыны – Шчытоўку.

І мы не памыліліся. Леанард Міхайлавіч забег у рэдакцыю і, так бы мовіць, справаздачыўся. Расказаў, што ў гэтым годзе практыка пачалася напрыканцы мая і доўжылася да другой дэкады ліпеня. У «Шчытоўцы» былі студэнты першага – трэцяга курсаў.








На пытанне, чым адрознівалася сёлетняя практыка ад папярэдніх, Л.М. Мяржвінскі адказаў, што амаль што нічым. Практыканты разам з выкладчыкамі здзяйснялі шматкіламетровыя экскурсіі па лесе і лузе, хадзілі на балоты, дзе вывучалі раслінны свет, адшуквалі рэдкія травы і кветкі, збіралі гербарыі і рабілі чучалы птушак і рыб. Дарэчы, моладзі пашчасціла знайсці дзве расліны, занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі.

Трэба адзначыць, што практыка для студэнтаў біялагічнага факультэта – гэта штодзённая карпатлівая праца, кожная гадзіна распісана. Удзень хлопцы і дзяўчаты збіралі матэрыялы, каб потым іх апрацаваць і падрыхтаваць наглядныя дапаможнікі для школ. Цікава праводзілі студэнты і вольны час.

Як зазначыў загадчык кафедры батанікі, практыка на біялагічным – гэта брэнд факультэта. Але самае галоўнае – гэта тое, што студэнты вучацца разам працаваць, дапамагаюць адзін аднаму, набываюць веды, авалодваюць практычнымі ўменнямі – адным словам, прафесійна ўдасканальваюцца.

**Настасся НАРКЕВІЧ.**

**На здымках:** *(уверсе)* студэнты-біёлагі святкуюць Купалле, *(злева направа)* вось ён, доўгачаканы прывал, на якім Леанард Міхайлавіч распавядае хлопцам і дзяўчатам розныя цікавыя легенды і паданні, звязаныя з прыродай; студэнты разам з выкладчыкам В.В. Кузьменкам за працай.

**Фота з архіва біялагічнага факультэта.**